(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ**

УДК 327 (091): 930.1

ГУРЫН АЛЯКСАНДР ВАЛЕР'ЕВІЧ

# ДАСЛЕДАВАННІ ГІСТОРЫІ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН У БЕЛАРУСІ Ў 1980–2003 гг.

Спецыяльнасць 07. 00. 15 – гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі

**АЎТАРЭФЕРАТ**

дысертацыі на суіскание вучонай ступені кандыдата гістарычных навук

МІНСК, 2005

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

**Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце**


**Навуковы кіраўнік:** доктар гістарычных навук, прафесар Снапкоўскі Уладзімір Еўдакімавіч. Беларускі дзяржаўны універсітэт, кафедра міжнародных адносін

**Афіцыйныя апаненты:** доктар гістарычных навук, прафесар Космач Генадзь Аркадзевіч. УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка", кафедра новай і навейшай гісторыі

кандыдат гістарычных навук, дацэнт Астрога Віктар Аляксандравіч. Дзяржаўны мытны камітэт Рэспублікі Беларусь

**Апаніруючая арганізацыя:** Дзяржаўная навуковая ўстанова "Інстытут гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі"


Абарона адбудзецца 11 сакавіка 2005 г. у 16.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый на суісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук Д 02.01.20 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасу: г.Мінск, вул. Акадэмічная, 25, аўд. 303.
Тэл. вучонага сакратара: 284-00-01.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Аўтарэферат разасланы "10" лютага 2005 г.

Вучоны сакратар савета па абароне
дысертацый Д 02.01.20
доктар гістарычных навук, прафесар — В. Г. Шадурскі

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)



## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

Актуальнасць тэмы дысертацыі. Праблемы гісторыі міжнародных адносін, знешняй палітыкі Беларусі і замежных дзяржаў здаўна прыцягвалі ўвагу айчынных вучоных. У савецкія часы гэты заканамерны інтарэс, аднак, жорстка кантраляваўся, лімітаваўся і абмяжоўваўся. Сучасныя патрабаванні развіцця беларускай гістарычнай навукі, якія грунтуюцца на новых метадалагічных падыходах, актыўным і творчым успрыманні дасягненняў і вопыту даследаванняў замежных краін, шырокім выкарыстанні новых крыніц і дакументаў, дыктуюць неабходнасць пераасэнсавання і далейшага вывучэння гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі замежных краін і Беларусі.

Набыццё Рэспублікай Беларусь незалежнасці і правядзенне ёю самастойнай знешняй палітыкі патрабавала падрыхтоўкі ўласных дыпламатычных кадраў для Міністэрства замежных спраў; вывучэння вопыту замежных краін у гэтай галіне. Дзяржаўныя органы надаюць значную ўвагу мерам, накіраваным на ўдасканаленне знешнепалітычнага курса дзяржавы, правядзенне шматвектарнай знешняй палітыкі. Гэтыя працэсы не могуць ажыццяўляцца без далейшага паглыблення і пашырэння міжнародных даследаванняў.

У айчыннай гістарычнай навуцы фактычна адсутнічаюць спецыяльныя гістарыяграфічныя распрацоўкі, прысвечаныя аналізу работы беларускіх вучоных у галіне міжнароднай праблематыкі. Гэта робіць неабходным правядзенне паглыбленага вывучэння становішча спраў у гэтай галіне. Рэтраспектыўнае вывучэнне міжнародных даследаванняў у Беларусі мае вялікае пазнавальнае значэнне для разумення сучасных тэндэнцый іх развіцця, навуковага вывучэння і асэнсавання гістарычнага вопыту знешнепалітычнай дзейнасці беларускіх дзяржаў у розныя перыяды іх існавання, прагназавання тэндэнцый развіцця навуковых ведаў у гэтай дысцыпліне.

Акрамя навукова–практычнага значэння, гістарыяграфічныя даследаванні маюць таксама вялікі маральны і выхаваўчы сэнс для цяперашняга і будучага пакаленняў беларускіх гісторыкаў і спецыялістаў–міжнароднікаў. Зварот да нядаўняга мінулага гістарычнай навукі дае магчымасць зноў успомніць (і не забыць у будучым) імёны як вядомых вучоных, так і звычайных навуковых супрацоўнікаў, якія прысвяцілі сваё жыццё ў навуцы вывучэнню міжнароднай праблематыкі.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

Геаграфічныя і храналагічныя межы даследавання. У першую чаргу, у прадмет даследавання трапілі навуковыя працы (манаграфіі, артыкулы і дысертацыі), якія былі выкананы ў беларускіх навучальных і навукова–даследчых установах ці апублікаваныя ў Беларусі як беларускімі, так і замежнымі даследчыкамі.

Паколькі даследаванне гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі ў 1980–я гг. з'яўлялася арганічнай часткай савецкай гістарычнай навукі, то некаторыя беларускія даследчыкі абаранялі дысертацыі, друкавалі артыкулы і манаграфіі за межамі рэспублікі, у першую чаргу ў Маскве і Ленінградзе. У 1990–я гг. беларускія вучоныя атрымалі магчымасць выдаваць свае працы ў замежных краінах. У сувязі з гэтым у дысертацыі ажыццяўляецца аналіз прац, выдадзеных не толькі ў Беларусі, але і ў іншых рэспубліках былога СССР і новых незалежных дзяржавах, якія ўзніклі пасля яго распаду, а таксама ў "далёкім замежжы".

Каб больш грунтоўна прасачыць развіццё навукі ў азначанай галіне і выявіць яе асаблівасці, аўтарам была выкарыстана ўласная перыядызацыя, якая ахоплівае час з 1980 па 2003 гг. і падзяляе гэты перыяд на дзве часткі: 1) 1980–я гг. і 2) 1991–2003 гг. Падставай для такой перыядызацыі стала тое, што 1980–я гг. — апошняе дзесяцігоддзе развіцця беларускай савецкай гістарычнай навукі, а 1990–я гг. — першае дзесяцігоддзе развіцця гістарычнай навукі Рэспублікі Беларусь. На працягу больш чым дваццацігадовага перыяду ў дысертацыі прасочваюцца выразныя працэсы трансфармацыі ў беларускай навуцы міжнародных даследаванняў. У 1980–я гг. у беларускай гістарычнай навуцы быў замацаваны закладзены яшчэ ў 1960–1970–я гг. падмурак міжнародных даследаванняў, што дало значныя вынікі. Павялічылася колькасць і палепшылася якасць даследаванняў, пашырыліся іх храналагічныя і тэматычныя рамкі, было створана першае ў рэспубліцы спецыяльнае навуковае падраздзяленне па вывучэнню знешнепалітычнай праблематыкі — сектар гісторыі еўрапейскіх сацыялістычных краін Інстытута гісторыі АН БССР быў пераўтвораны ў 1983 г. у сектар гісторыі замежных сувязяў БССР.

Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі. Работа выконвалася ў межах навукова–даследчай тэмы кафедры міжнародных адносін БДУ "Знешняя палітыка Беларусі: праблемы і перспектывы (тэрмін даследавання — 2001–2005 гг.).

Мэта і задачы даследавання. Мэтай даследавання з'яўляецца вывучэнне беларускай гістарычнай навукі ў галіне гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі Беларусі і замежных краін ў 1980–2003 гг.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


Задачы даследавання:

1. Прааналізаваць галоўныя тэндэнцыі развіцця міжнародных даследаванняў у Беларусі ў азначаны перыяд у сувязі з агульнай эвалюцыяй беларускай гістарычнай навукі;
2. Зрабіць своеасаблівую "інвентарызацыю" навуковай дзейнасці беларускіх вучоных у галіне вывучэння праблем міжнародных адносін і знешняй палітыкі;
3. Вызначыць і класіфікаваць асноўныя праблемна–тэматычныя кірункі міжнародных даследаванняў у Беларусі ў азначаны перыяд;
4. Ахарактарызаваць дзейнасць галоўных структурных падраздзяленняў (кафедраў, аддзелаў, цэнтраў і інш.) у галіне міжнародных даследаванняў.

Аб`ект і прадмет даследавання. Аб`ектам даследавання з`яўляецца беларуская гістарычная навука перыяду 1980–2003 гг. Прадметам — гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі Беларусі і замежных дзяржаў як самастойная гістарычная дысцыпліна, што валодае ўласнай спецыфікай і праблематыкай. У прадмет даследавання таксама ўвайшлі праблемы юрыдычнай (міжнароднае права, гісторыя дзяржавы і права Беларусі) і палітычнай навук, звязаныя з гісторыяй і сучаснымі праблемамі міжнародных адносін.

Метадалогія і метады праведзенага даследавання. Метадалагічнай асновай праведзенага даследавання абраны такія базавыя прынцыпы навуковага пазнання, як аб`ектыўнасць і гістарызм, што дазволіла метадалагічна абгрунтавана вывучыць працэсы развіцця даследаванняў у галіне гісторыі міжнародных адносін у Беларусі.

Даследаванне зроблена з прымяненнем агульнанавуковых і спецыяльна–гістарычных метадаў. Да першай групы можна аднесці аналіз, сінтэз, абагульненне, параўнанне, індукцыю, дэдукцыю і шэраг іншых. Да другой групы — гісторыка–генетычны, гісторыка–параўнаўчы і гісторыка–сістэмны метады. Неабходнасць выкарыстання тых ці іншых метадаў ставілася ў залежнасць ад мэтаў і задач даследавання.

Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў. У дысертацыі ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі вывучана развіццё навуковых ведаў у Беларусі ў галіне гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі Беларусі і замежных краін у 1980–2003 гг. Прааналізаваны асноўныя кірункі міжнародных даследаванняў; абагульнены дасягненні і выяўлены праблемы развіцця беларускай гістарычнай навукі ў згаданай галіне. Устаноўлена, што беларуская гістарыяграфія міжнародных даследаванняў у 1980–я гг. развівалася ў межах двух асноўных кірункаў:

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)
праблематыка гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі замежных, у першую чаргу еўрапейскіх, дзяржаў і праблематыка гісторыі знешнепалітычнай дзейнасці і замежных сувязяў БССР.

Разгледжаны метадалагічныя, інстытуцыянальныя і структурна-арганізацыйныя змены ў развіцці навуковых даследаванняў дадзенай галіны гістарычнай навукі, якія назіраліся ў 1991—2003 гг. Зроблена высновa, што ў гэты час у галіне арганізацыі даследаванняў міжнародных адносін у Беларусі адбыліся значныя пераўтварэнні: стварыліся новыя дзяржаўныя і недзяржаўныя даследчыя цэнтры, мадэрнізаваліся навуковыя структуры, якія склаліся раней. Выяўлена, што ў межах міжнародных даследаванняў у Беларусі пачалі фарміравацца новыя навуковыя кірункі і вучэбныя дысцыпліны, такія як: "Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі", "Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь", "Гісторыя міжнародных адносін", "Тэорыя міжнародных адносін". Ажыццяўлялася падрыхтоўка кваліфікаваных кадраў праз магістратуру, аспірантуру і дактарантуру, дзейнасць спецыялізаваных саветаў па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый.

Практычная значнасць атрыманых вынікаў. Вынікі дысертацыі могуць быць выкарыстаны для далейшага вывучэння беларускай гістарыяграфіі ў галіне гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі і іншых гістарычных спецыяльнасцей, у тым ліку "Гісторыя Беларусі", "Усеагульная гісторыя", "Гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання".

Матэрыялы работы будуць карыснымі пры падрыхтоўцы лекцыйных курсаў, навучальных дапаможнікаў і падручнікаў у межах такіх дысцыплін, як "Гісторыя міжнародных адносін", "Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі", "Міжнародныя арганізацыі", "Актуальныя праблемы знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь", "Гістарыяграфія гісторыі Беларусі", "Гістарыяграфія і крыніцазнаўства міжнародных адносін", розных раздзелаў гісторыі Беларусі і ўсеагульнай гісторыі; пры выкананні дысертацыйных даследаванняў у межах гэтых спецыяльнасцяў і дысцыплін.

Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.

1. Беларуская гістарыяграфія міжнародных даследаванняў у 1980–я гг. развівалася ў межах двух асноўных кірункаў, якія былі закладзены ў 1960–1970–я гг. Першы кірунак складала праблематыка гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі замежных (еўрапейскіх) дзяржаў, якая ахоплівала перыяд ад позняга Сярэднявякоўя да канца XX ст. Дысертацыі па гэтай праблематыцы абараняліся ў спецыялізаваным савеце БДУ па спецыяльнасці 07.00.03 — "Усеагульная гісторыя".

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

Цэнтрам навуковых даследаванняў з'яўляўся БДУ (кафедра гісторыі новага і навейшага часу). На гэтай кафедры і вакол яе склалася беларуская школа даследчыкаў гісторыі міжнародных адносін, прадстаўленая дактарамі і кандыдатамі навук;

2. Другі асноўны кірунак міжнародных даследаванняў у Беларусі ў 1980–я гг. складала праблематыка гісторыі знешнепалітычнай дзейнасці і замежных сувязяў БССР пасля 1944 г. Дысертацыі па гэтай праблематыцы абараняліся ў спецыялізаваным савеце пры Інстытуце гісторыі АН БССР па спецыяльнасці 07.00.02 — "Гісторыя СССР". Цэнтрам навуковых даследаванняў з'яўляўся Інстытут гісторыі АН БССР (сектар гісторыі замежных сувязяў БССР). На базе гэтага сектара і вакол яго склалася беларуская школа даследчыкаў знешнепалітычнай гісторыі БССР, прадстаўленая дактарамі і кандыдатамі навук;

3. У 1990–я гг. у галіне арганізацыі даследавання міжнародных адносін у Беларусі адбыліся значныя перамены. Цэнтрам міжнародных даследаванняў стаў факультэт міжнародных адносін БДУ. Вучоныя кафедр міжнародных адносін, дыпламатычнай і консульскай службы і шэрагу іншых спецыялізаваліся ў вывучэнні сучасных міжнародных адносін, гісторыі знешняй палітыкі Беларусі і замежных дзяржаў пасляваеннага перыяду. Абарона дысертацый ажыццяўлялася ў спецыялізаваным савеце пры БДУ па новай спецыяльнасці 07.00.15 – "Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі". На базе кафедры міжнародных адносін ФМА БДУ, у складзе якой у 2003 г. працавала 5 дактароў гістарычных навук, і вакол яе фарміравалася беларуская школа даследчыкаў сучасных міжнародных адносін і знешняй палітыкі Беларусі;

4. У канцы 1980–х–пачатку 1990–х гг. у сувязі са зменай пакаленняў даследчыкаў і структурнымі зменамі ў БДУ, міжнародная праблематыка адыйшла на другі план у навуковай тэматыцы кафедр гістарычнага факультэта БДУ. З другой паловы 1990–х гг. узрасла цікавасць да гісторыка–дыпламатычных даследаванняў на зноўстварыных кафедрах гісторыі Расіі і гісторыі паўднёвых і заходніх славян, знешнепалітычная тэматыка аднавілася на кафедры гісторыі новага і навейшага часу БДУ. Змяненні даследчай тэматыкі адбыліся і ў аддзеле нацыянальных і міжнародных адносін Інстытута гісторыі НАН Беларусі, які ў 2001 г. быў перайменаваны ў аддзел усеагульнай гісторыі новага і навейшага часу. У яго значна скарочаным складзе знешнепалітычная тэматыка адыйшла на другі план. Знешнепалітычная гісторыя Беларусі часоў ВКЛ і Расійскай імперыі стала вывучацца у іншых аддзелах Інстытута гісторыі НАН Беларусі і ў некаторых ВНУ краіны;

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


5. З пачатку 1990–х гг. у межах міжнародных даследаванняў у Беларусі фарміруюцца новыя навуковыя кірункі і вучэбныя дысцыпліны, такія як: "Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі", "Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь", "Гісторыя міжнародных адносін" і інш. Іх з'яўленне ў беларускай гістарычнай навуцы і навучальным працэсе вышэйшай школы было абумоўлена абвяшчэннем незалежнасці Беларусі і глыбокімі трансфармацыямі ў беларускай гістарыяграфіі. Інстытуцыяналізацыя гэтых дысцыплін адбывалася дзякуючы іх замацаванню ў навуковай дзейнасці і навучальным працэсе навуковых і навучальных установ краіны, публікацыі навуковых прац, манаграфій, вучэбных праграм і дапаможнікаў, абароне доктарскіх и кандыдацкіх дысертацый у спецыялізаваных саветах.

Асабісты ўклад суіскальніка. Дадзеная дысертацыя з`яўляецца самастойнай аўтарскай працай. Пры яе падрыхтоўцы вывучана значная колькасць манаграфій, дысертацый, артыкулаў айчынных вучоных па тэме даследавання, а таксама айчынныя і замежныя тэарэтычныя працы ў галіне гістарыяграфіі. Гістарыяграфічны матэрыял, сабраны аўтарам, дазволіў прааналізаваць вывучэнне праблем міжнародных адносін у Беларусі ў 1980–1990–я гг. і першыя гады XXI ст. як асобнай часткі беларускай гістарычнай навукі. Вынікі даследавання былі дасягнуты непасрэдна аўтарам дадзенай працы.

Апрабацыя вынікаў даследавання. Асноўныя вынікі даследаванняў аўтара дысертацыі былі прадстаўлены на 7 канферэнцыях рознага ўзроўню, а менавіта: "60–я научная конференция студентов и аспирантов Белорусского государственного университета" (Мінск, 2003); "V межвузовская научно–методическая конференция молодых ученых" (Брэст, 2003); "Праблемы сацыяльна–эканамічнага, палітычнага і прававога развіцця грамадства ў кантэксце агульнаеўрапейскіх і сусветных інтэграцыйных працэсаў" (Мінск, 2004); "IX Республиканская научная конференция студентов и аспирантов Республики Беларусь: НИРС–2004" (Гродна, 2004), "61–я научная конференция студентов и аспирантов Белорусского государственного университета" (Мінск, 2004), "XXI век: актуальные проблемы исторической науки" (Мінск, 2004), "Проблемы экономики, управления и образования" (Мінск, 2004).

Вынікі даследавання выкарыстоўваліся аўтарам пры выкладанні навучальных курсаў у вышэйшай школе.

Дысертацыя абмеркавана і рэкамендавана да абароны на пасяджэнні кафедры міжнародных адносін факультэта міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

Апублікаванасць вынікаў. Асноўныя вынікі дысертацыйнага даследавання апублікаваны ў 7 артыкулах у навуковых часопісах і зборніках, 3 матэрыялах канферэнцый. Агульны аб`ём апублікаваных матэрыялаў складае 51 старонку.

Структура і аб`ём дысертацыі. Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц і дадаткаў. Поўны тэкст дысертацыі складае 152 старонкі, у тым ліку, спіс выкарыстаных крыніц — 29 старонак (372 адзінкі), дзесяць дадаткаў — 24 старонкі.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

**У першай главе "Гістарыяграфія, крыніцы і метады даследавання"** даецца аналіз гістарыяграфіі і выкарыстаных крыніц па тэме дысертацыі, выкладаецца метадалогія праведзенага даследавання.

У першым раздзеле на аснове праблемнага падыходу з улікам эмпірычнага і тэарэтычнага ўзроўняў распрацоўкі адпаведных пытанняў разглядаюцца гістарыяграфічныя працы, якія прысвечаны праблематыцы дадзенай дысертацыі.

Гісторыя гістарычнай навукі Беларусі была і застаецца адным з маладаследаваных кірункаў ва ўсім комплексе айчынных гістарычных ведаў. Стан даследаванняў у галіне гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі, як асобнага напрамку беларускай гістарычнай навукі на дысертацыйным узроўні ў айчыннай гістарыяграфіі не разглядаўся. Тым больш адсутнічаюць распрацоўкі прысвечаныя іх развіццю ў 1980–1990–я гг. Аднак нельга сказаць, што азначаная праблематыка поўнасцю выпала з–пад увагі гісторыкаў і прадстаўнікоў іншых грамадствазнаўчых навук. Па шэрагу аспектаў ёсць публікацыі, якія ўтрымліваюць пэўны тэарэтычны і эмпірычны матэрыял. Усю наяўную літаратуру можна падзяліць на тры групы, зыходзячы з крытэрыя адлюстравання ў ёй гістарыяграфічных праблем гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі.

Па–першае, гэта гістарыяграфічныя працы. Да іх адносяцца манаграфіі і артыкулы прысвечаныя гісторыі гістарычнай навукі ў 1980–1990–я гг. Гэта манаграфіі У. М. Міхнюка, П. Ц. Петрыкава і Г. Г. Сяргеевай; артыкулы Ю. Л. Казакова, У. С. Кошалева, П. А. Лойкі, У. Е. Снап-

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)
"Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі" на базе кафедры міжнародных адносін ФМА БДУ, у складзе якой па стану на 2003 г. працавала 5 дактароў гістарычных навук, фарміравалася беларуская школа даследчыкаў сучасных міжнародных адносін і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь [1; 4; 6; 7; 10];

4. У канцы 1980–х–пачатку 1990–х гг. у сувязі са зменай пакаленняў даследчыкаў і структурнымі зменамі міжнародная праблематыка часова адыйшла на другі план у навуковай тэматыцы кафедр гістарычнага факультэта БДУ. Аднак, з другой паловы 90–х гг. узнаўляецца цікавасць да гісторыка–дыпламатычных даследаванняў на нова-створаных кафедрах гісторыі Расіі і гісторыі паўднёвых і заходніх славян, кафедры гісторыі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта БДУ. Змяненні даследчай тэматыкі адбыліся і ў аддзеле нацыянальных і міжнародных адносін Інстытута гісторыі НАН Беларусі, які ў 2001 г. быў перайменаваны ў аддзел усеагульнай гісторыі новага і навейшага часу. У яго значна скарочаным складзе знешнепалітычная тэматыка адыйшла на другі план. Знешнепалітычная гісторыя Беларусі часоў ВКЛ і Расійскай імперыі стала вывучацца ў іншых аддзелах Інстытута гісторыі НАН Беларусі і на некаторых кафедрах гістарычных факультэтаў беларускіх ВНУ. Беларускай навукай былі дасягнуты прыкметныя поспехі ў галіне міжнародных адносін. У 1990–2003 гг. было абаронена 7 доктарскіх і 24 кандыдацкія дысертацыі, выйшла з друку больш за 30 манаграфій[1; 2; 3; 7; 9; 10];

5. З пачатку 1990–х гг. у межах міжнародных даследаванняў у Беларусі фарміруюцца новыя навуковыя кірункі і вучэбныя дысцыпліны, такія як: "Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі", "Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь", "Гісторыя міжнародных адносін" і інш. Іх з'яўленне ў беларускай гістарычнай навуцы і навучальным працэсе вышэйшай школы было абумоўлена абвяшчэннем незалежнасці Беларусі і глыбокімі трансфармацыямі ў беларускай гістарыяграфіі. Інстытуцыяналізацыя гэтых дысцыплін адбывалася дзякуючы іх замацаванню ў навуковай дзейнасці і навучальным працэсе навуковых і навучальных устаноў краіны, з'яўленню навуковых прац, манаграфій, зборнікаў дакументаў, вучэбных праграм і дапаможнікаў, дзейнасці магістратуры, аспірантуры і дактарантуры, працы спецыялізаваных саветаў па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый, правядзенню міжнародных і нацыянальных канферэнцый, семінараў і сімпозіўмаў, выкананню даследчых і інавацыйных праектаў у нацыянальным і міжнародным маштабе [3; 4; 6].

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ АЎТАРА ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ


1. Гурын А. В., Снапкоўскі У. Е. Аб навуковых даследаваннях кафедры міжнародных адносін факультэта міжнародных адносін БДУ (1992–2002 гг.) // Белорусский журнал международного права и международных отношений.– 2002.– № 3.– С. 46–51.

2. Гурын А. В. Знешняя палітыка еўрапейскіх краін у даследаваннях беларускіх навукоўцаў (1980–1990–я гг.) // Проблемы экономики и управления: Сб. науч. ст. преп. / Под общ. ред А. Е. Михневича.– Минск: Частный институт управления и предпринимательства, 2003.– С. 98–99.

3. Гурын А. В. Асноўныя кірункі даследаванняў гісторыі знешняй палітыкі Беларусі (1980–1990–я гг.) // Научные труды преподавателей ИУиП 2003 г.: Сб. науч. работ / Под общ. ред. В. Я. Кожара.– Минск: Частный институт управления и предпринимательства, 2004.– С. 111–118.

4. Гурын А. В. Вывучэнне гісторыі міжнародных адносін у Беларусі ў 1980–1990–я гг.: асноўныя накірункі даследаванняў // Белорусский журнал международного права и международных отношений.– 2004.– № 3.– С. 75–78.

5. Гурын А. В. Вывучэнне праблем міжнародных адносін на гістарычным факультэце БДУ ў 1980–я гг. // Вестн. Белорус. ун–та. Сер. 3.– 2004.– № 1.– С. 34–39.

6. Гурын А. В. Гістарыяграфія знешнепалітычнай гісторыі Беларусі ў 1980–2003 гг. // Гуманітарна–эканамічны веснік.– 2004.– № 1.– С. 70–84.

7. Гурын А. В. Праблемы гісторыі міжнародных адносін у беларускай гістарыяграфіі (1980–1990–я гг.) // Вестник Академии МВД Республики Беларусь.– 2004.– № 1.– С. 129–132.

8. Гурын А. В. Развіццё даследаванняў па гісторыі знешняй палітыкі Беларусі ў 1980–1990–я гг. // Прававыя і інстытуцыянальныя праблемы сацыяльна–эканамічных пераўтварэнняў у Рэспубліцы Беларусь: Матэрыялы Рэсп. нав.–практ. канф. студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў. Мінск, 16 мая 2003 г. / Нав. рэд.: С. Ф. Сокал, А. У. Руцкі, У. А. Калупаеў.– Мінск: НА ТАА "БІП–С", 2003.– С. 16–17.

9. Гурын А. В. Даследаванне праблем міжнародных адносін беларускімі гісторыкамі (1980–2002 гг.) // IX Республиканская научная конференция студентов и аспирантов Республики Беларусь «НИРС–2004»: тезисы докладов: в 8 ч. Ч. 1 / Под ред. д–ра пед. наук, проф. А. И. Жука.– Гродно: ГрГУ, 2004.– С. 85–86.

10. Гурын А. В. Праблемы знешняй палітыкі Беларусі ў даследаваннях беларускіх навукоўцаў // Праблемы сацыяльна–эканамічнага, палітычнага і прававога развіцця грамадства ў кантэксце агульнаеўрапейскіх і сусветных інтэграцыйных працэсаў: Матэрыялы міжнароднай нав.–практ. канф. маладых навукоўцаў і студэнтаў. Мінск, 14 мая 2004 г. / Пад. рэд. С. Ф. Сокала, А. У. Руцкага. –Мінск: НА ТАА "БІП–С", 2004.– С. 16–17.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


# РЭЗЮМЭ

Гурын Аляксандр Валер'евіч

## ДАСЛЕДАВАННІ ГІСТОРЫІ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН У БЕЛАРУСІ У 1980–2003 гг.

Ключавыя словы: *міжнародныя адносіны, знешняя палітыка Беларусі і замежных краін, міжнародныя даследаванні ў Беларусі, гістарыяграфія, гісторыя гістарычнай навукі, навуковыя цэнтры, навукова даследчая работа, кафедра, манаграфія, дысертацыя, навуковы артыкул.*

Аб`ектам даследвання з`яўляецца беларуская гістарычная навука перыяду 1980–2003 гг. Прадметам — гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі Беларусі і замежных дзяржаў, як самастойная гістарычная дысцыпліна. У прадмет даследавання таксама ўвайшлі пытанні юрыдычнай (міжнароднае права, гісторыя дзяржавы і права Беларусі) і палітычнай навук, звязаныя з міжнароднымі адносінамі.

Мэтай даследавання з`яўляецца вывучэнне айчыннай гістарычнай навукі ў галіне гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі Беларусі і замежных краін у 1980–2003 гг.

У дысертацыі былі выкарыстаны агульнанавуковыя і спецыяльна–гістарычныя метады (гісторыка–генетычны, гісторыка–параўнаўчы і гісторыка–сістэмны).

Навуковая навізна дадзенага даследавання заключаецца ў тым, што ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі вывучана развіццё навуковых ведаў у Беларусі ў галіне гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі Беларусі і замежных краін. Наватарскі характар мае аналіз асноўных кірункаў міжнародных даследаванняў, абагульненне галоўных дасягненняў беларускай гістарычнай навукі ў згаданай галіне ў 1980–2003 гг. Прааналізаваны дысертацыйныя даследаванні, выкананыя па міжнароднай праблематыцы.

Вынікі дысертацыі могуць быць выкарыстаны для далейшага вывучэння беларускай гістарыяграфіі гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі, тэорыі міжнародных адносін. Асобныя палажэнні могуць выступіць у якасці матэрыялу для вызначэння прыярытэтаў далейшага развіцця міжнародных даследаванняў у рэспубліцы, а таксама пры распрацоўцы шэрагу навучальных курсаў, выкладаемых у ВНУ рэспублікі, пры напісанні дысертацыйных прац па адпаведных спецыяльнасцях.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

## РЕЗЮМЭ

Гурин Александр Валерьевич

### ИССЛЕДОВАНИЯ ИСТОРИИ МЕЖДУНАРОДНЫХ ОТНОШЕНИЙ В БЕЛАРУСИ В 1980–2003 гг.

Ключевые слова: *международные отношения, внешняя политика Республики Беларусь и зарубежных стран, международные исследования в Беларуси, историография, история исторической науки, научные центры, научно–исследовательская работа, кафедра, монография, диссертация, научная статья.*

Объектом исследования является белорусская историческая наука, ее развитие в 1980–2003 гг. Предметом — история международных отношений и внешней политики, как самостоятельная историческая дисциплина. В предмет исследования также вошли вопросы юридической (международное право, история государства и права Беларуси) и политической наук, связанные с международными отношениями.

Целью исследования является анализ отечественной исторической науки в сфере истории международных отношений и внешней политики Беларуси и зарубежных стран в 1980–2003 гг.

В диссертации использованы общенаучные и специально–исторические методы (историко–генетический, историко–сравнительный, историко–системный).

Научная новизна исследования заключается в том, что впервые в отечественной историографии изучено развитие истории международных отношений и внешней политики Беларуси и зарубежных стран. Новаторский характер имеет анализ основных направлений международных исследований, обобщение главных достижений белорусской науки в названной сфере в 1980–2003 гг. Проанализированы диссертационные исследования, выполненные по международной проблематике.

Результаты исследования могут быть использованы для дальнейшего изучения белорусской историографии истории международных отношений и внешней политики, теории международных отношений. Некоторые положения могут выступить в качестве материала для определения приоритетов дальнейшего развития международных исследований в республике, а также при разработке ряда учебных курсов, которые преподаются в ВУЗах республики, при написании диссертационных работ по соответствующим специальностям.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)



SUMMARY

Guryn Alyaksandar Valer'yavich

Studying of the history of international relations in Belarus in the period of the years 1980–2003

Key words: *international relations, foreign policy of Belarus and foreign countries, international research in Belarus, historiography, history of historical science, scientific centers, research effort, department, monography, dissertation, scientific article.*

The object of studying is Belarusian historical science within the period 1980–2003. The subject of studying is the history of international relations and of foreign policy as an independent branch of historical science. The subject also embraces questions of juridical science (international law, state and law history of Belarus) and political science concerned with international relations.

Analysis of native historical science in the sphere of history of international relations and foreign policy of Belarus and foreign countries in the period 1980–2003 is the studying objective.

There were applied in dissertation common scientific and special historical methods (historical-genetic, historical–comparative and historical–systematical).

Scientific novelty of the present work lies in the first time in native historiography integrated study of the development of international relations and foreign policy. Pioneering character belongs to analysis of the main trends of international studying and to generalization of Belarusian historical science main achievements in the mentioned field in 1980–2003. Dissertation studying of international problems are specially characterized.

Present work results can be used for further studying of Belarusian scientists researches in the sphere of international relations and foreign policy history and in the sphere of international relations theory. Some thesis can be used as a background to define the priorities of further development of international research work in the Republic, for scheduling the curriculum of higher education institutes of our republic and while writing dissertations.